# ШКОЛЬНІКІ НА КВЭСЦЕ «ВДУ СТАРТ»

***Больш за 300 навучэнцаў школ з усёй Віцебскай вобласці прынялі ўдзел у вялікім адукацыйным квэсце «ВДУ старт». Хлопцы і дзяўчаты настолькі былі ўражаныя ўбачаным у нашым універсітэце, што не хацелі ехаць дадому.***

І гэта нездарма, бо ВДУ ёсць што паказаць і чым натхніць будучых абітурыентаў, якія па нейкіх прычынах яшчэ сумняваюцца, якую ўстанову вышэйшай адукацыі выбраць для навучання. Сучасныя лабараторыі, шыкоўная актавая зала, выдатны планетарый, спартыўныя залы, цудоўная навуковая бібліятэка – гэта няпоўны спіс лакацый ВДУ, якія паспелі пабачыць школьнікі падчас праходжання 17 станцый квэста.

Перад пачаткам падарожжа па ўніверсітэце навучэнцы разам з настаўнікамі сабраліся ў актавай зале. Іх вітала прарэктар па вучэбнай рабоце, кандыдат геаграфічных навук, дацэнт Міраслава Бобрык. Міраслава Юзэфаўна нагадала будучым абітурыентам, што ў іх ёсць шанец стаць студэнтам ВДУ яшчэ да пачатку прыёмнай кампаніі. А дапаможа ў гэтым універсітэцкая алімпіяда. Яшчэ можна паступаць ва ўніверсітэт па мэтавым накіраванні, у гэтым выпадку будзе неабходна здаць толькі адзін унутраны экзамен.



Пасля слоў прывітання каманды школьнікаў на чале з валанцёрамі накіраваліся па сваім маршруце, каб у займальнай форме пазнаёміцца з ВДУ і адчуць атмасферу кожнага факультэта. Дзве гадзіны квэста праляцелі незаўважна. Хлопцы і дзяўчаты актыўна дзяліліся ўражаннямі ад убачанага і прызнаваліся, што палюбілі ўніверсітэт з першага погляду.

Прыемна, што некаторыя навучэнцы гаварылі пра тое, што ў ВДУ не ў першы раз, што ўжо вызначыліся з факультэтам і спецыяльнасцю. Да прыкладу, Соф’я Аўчыннікава з сярэдняй школы №2 г.п. Бешанковічы адзначыла, што прыязджала ў ВДУ на Дзень адчыненых дзвярэй, а таксама наведвала педагагічны факультэт, бо хоча навучацца менавіта там.

**Алеся ДУБРОЎСКАЯ.**

Фота- і відэарэпартаж з квэста глядзіце з дапамогай QR-кода.